# Кніжная паліца



**Гісторыя беларускай кнігі: у 2 т. / М.В. Нікалаеў [і інш.]; навук. рэд.: В.В. Антонаў, М.В. Нікалаеў. — Мінск: Бел. энцыкл., 2009-2011.**

Перагортваючы першую старонку падручніка, мы нават не задумваемся, калі з'явіліся першыя кнігі, якімі яны былі. Адказаць на гэта пытанне дапаможа двухтомнае выданне "Гісторыя беларускай кнігі", якое ахоплівае перыяд ад самых першых рукапісных кніг да канца ХХ стагоддзя.

Першы том выдання прысвечаны кніжнай культуры Вялікага княства Літоўскага за ўвесь перыяд існавання гэтай дзяржавы. Другі том знаёміць з беларускай кніжнай культурай ад часу ўваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі да нашых дзён.

Адметнай асаблівасцю выдання з'уляюцца шматлікія ілюстрацыі і фатаздымкі першых рукапісных выданняў: "Полацкае Евангелле (XII, XIV стст.)", "Лаўрышаўскае Евангелле" (рукапісны помнік Іпал. XIV ст.), "Радзівілаўскі летапіс", (летапісны звод пач. XIIIст.),а таксама беларускіх газет і часопісаў: "Наша Ніва", "Наша Доля", "Лучынка",вокладкі і тытульныя лісты першых друкаваных выданняў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі,у час Вялікай Айчыннай вайны.

Змястоўны раздел, у якім раскрыта выдавецкая дзейнасць беларускай эміграцыі. Асобныя артыкулы прысвечаны развіццю бібліятэчнай справы на Беларусі. Цікавыя звесткі прыведзеныя пра манастырскія бібліятэкі,Віленскую публічную бібліятэку, бібліятэкі Сапегаў, Храптовічаў.

У гэтым жа выданні можна атрымаць падрабязную інфармацыю пра развіццё беларускага кнігавыдання ў 1991-2010 гадах, калі краіна стала незалежнай.

**Анастасія КРЫШЧЫК,**
**бібліятэкар Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага.**